# КАМЕНТАРЫІ

У задачу гэтай часткі зборніка – Каментарыяў, – не ўваходзіць падрабязны аналіз працэсу ўзнікнення і функцыянавання рэпрэсіўнага механізму, а таксама гісторыя рэабілітацыйных працэсаў. У цэнтры ўвагі – юрыдычныя акты, паводле якіх адбываліся рэпрэсіі, а таксама пазнейшыя рэабілітацыі.

## Рэпрэсіўнае заканадаўства БССР і РСФСР 1920-х — 1960-х гадоў

Трэба адзначыць, што з першых дзён свайго ўсталявання савецкая ўлада выявіла сябе як рэпрэсіўная сістэма, якая адкінула ўсё ранейшае заканадаўства і правасвядомасць. У пачатковы перыяд рэвалюцыйныя трыбуналы карысталіся дэкрэтамі, бо ў 1918 г. Уладзімір Ульянаў забараніў судам выкарыстоўваць старыя законы. А ў «Палажэнні аб народным судзе РСФСР» указвалася, што суд «у выпадку адсутнасці адпаведнага дэкрэта або непаўнаты такога, кіруецца сацыялістычнай правасвядомасцю». Гэтае «вынаходніцтва» савецкай юрыдычнай сістэмы можна паставіць у адзін шэраг з пазнейшай тэорыя пракурора А. Вышынскага, паводле якой прызнанне абвінавачанага сваёй віны з'яўлялася вяршыняю доказу і было дастатковым для асуджэння чалавека за любое злачынства. Ужо апублікавана маса сведчанняў і мы ведаем, якімі сродкамі фізічнага ўздзеяння дасягаліся гэтыя прызнанні.

Але, пачынаючы з другой паловы 1920-х гадоў, існавала імкненне надаваць рэпрэсіям ужо законную форму. У гэтым ключавую ролю мусілі выконваць Крымінальныя Кодэксы (КК) як сістэматычныя заканадаўчыя акты, якія ўстанаўлівалі прынцыпы крымінальнай адказнасці, давалі пералік дзеянняў, што прызнаваліся злачынствамі, а таксама фіксавалі пакаранні за іх. Крымінальны Кодэкс складаецца з 2 частак – Агульнай і Асаблівай. У Агульнай частцы фармулююцца базавыя палажэнні і задачы крымінальнага заканадаўства; у Асаблівай частцы даецца сістэматычны пералік злачынстваў з пазначэннем відаў і памераў пакарання.

Крымінальны Кодэкс РСФСР быў прыняты 1 чэрвеня 1922 г. Для нашай тэмы гэты дакумент важны тэм, што менавіта Кодэкс 1922 г., а таксама яго рэдакцыя 1926 г., дзейнічаў у БССР да 1928 г. (добрая ілюстрацыя да суверэнітэту рэспублік, якія «утварылі» СССР).

Я магу падзяліцца ўласным ураджаннем ад знаёмства з гэтым Кодэксам – вельмі цяжка набіраць на кампутары такі тэкст. З-за рыторыкі, зусім не ўласцівай юрыдычнаму дакументу, думка збіваецца, словы блытаюцца. Такія канцэпты савецкай юрыдычнай сістэмы як «неданясенне» і антысавецкая (тады яшчэ контррэвалюцыйная) «прапаганда і агітацыя» былі сфармуляваныя ўжо ў гэтым Кодэксе. Але прысутнічаюць, між іншым, і моцныя маёмасныя матывы – канфіскацыя маёмасці устанаўліваецца як

складовая частка любога пакарання за дзеяння, якое кваліфікуецца як контррэвалюцыйнае злачынства. Мне здаецца, што гэты момант маёмаснай зацікаўленасці дзяржавы і рэпрэсіўных органаў недаацэненыя даследчыкамі савецкай гісторыі.

У 1926 г. контррэвалюцыйныя злачынствы былі аднесеныя да аднаго артыкула – 58. Менавіта гэты артыкул быў базавам для афармлення масавых рэпрэсіяў, таму яго нумар стаў «хадзячай назвай». Калі ў ліпені 1988 г., пасля адкрыцця першых фактаў злачынстваў у Курапатах, у Мінску ўтваралася арганізацыйная група Таварыства Памяці Ахвяраў Сталінізму «Мартыралог Беларусі», то яна атрымала назву *«Камітэт – 58»*. У Статуце таварыства такі выбар быў патлумачаны тым, што гэта назва ёсць «напамін аб адпаведным артыкуле Крымінальнага Кодэкса РСФСР, па якім былі несправядзіва асуджаныя міліёны людзей ва ўсіх рэспубліках СССР»[1].

Першы Крымінальны Кодэкс БССР быў зацверджаны ЦВК на 3-й сэсіі VIII склікання 23 верасня 1928 г., а ўведзены ў дзеянне з 15 лістапада 1928 г. Гэты Кодэкс быў перапісаны з КК РСФСР, але з іншай нумарацыяй артыкулаў. Контррэвалюцыйным злачынствам прысвечаныя тут артыкулы 63—76. Вызначэнні гэтых злачынстваў былі вельмі шырокія і неканкрэтныя. З 17 складаў контррэвалюцыйных злачынстваў 14 прадугледжвалі вышэйшую меру пакарання.

У Крымінальным Кодэксе БССР 1928 г. увогуле ў вочы кідаецца моцная ідэалагізацыя, якая зусім не пасуе юрыдычнаму дакументу, бальшавіскай рыторыкай прасякнуты кожны артыкул акта. Усе злачынствы падзяляліся на дзве катэгорыі: 1) накіраваныя супраць савецкага ладу; 2) усе астатнія. Радыкальна размежаваныя былі паводле гэтых катэгорый прынцыпы пакарання – за злачынствы першай катэгорыі ўсталёўвалася толькі ніжняя мяжа, ніжэй якой пакаранне не магло быць прызначаным; за злачынствы другой катэгорыі ўказвалася вышэйшая мяжа. Паводле Кодэксу 1928 г. найбольшы тэрмін абмежавання свабоды складаў 10 гадоў, але ў далейшым (у 1934 г.) гэты тэрмін быў даведзены да 25 год. Крымінальная адказнасць паводле Кодэкса за некаторыя злачынствы наступала з 12-гадовага ўзросту.

Адметная рыса тагачаснага савецкага права – выкарыстанне *метада аналогіяў*. Артыкул 6 КК БССР 1928 г. укзвалася, што калі адказнасць за нейкае злачынства не прадугледжаная гэтым Кодэксам, то межы адказнасці і пакарання суд можа вызначыць на аснове тых артыкулаў Кодэкса, якія найбольш падыходзяць да здзейсненага злачынства. Зразумела, што ва ўмовах адсутнасці незалежнай судовай сістэмы выкарыстанне метада аналогіяў стварала шырокія магчымасці для злоўжыванняў і ажыццяўлення палітыкі рэпрэсіяў.

---

[1] Гл. падрабязней: *Дэмакратычная апазыцыя Беларусі: 1956-1991. Пэрсанажы і кантэкст. Даведнік* / Пад рэдакцыяй Алега Дзярновіча. Мн.: Архіў Найноўшае Гісторыі, 1999. С. 116.

У рэпрэсіўнай практыцы вельмі актыўна выкарыстоўваліся наступныя артыкулы Крымінальнага Кодэксу:
63[1], 63[2], 63[3] – «Здрада Радзіме»;
64 – "Падрыхтоўка ўзброенага паўстання";
65 – "Зносіны ў контррэвалюцыйных мэтах з замежнай дзяржавай";
66 – "Аказанне дапамогі міжнароднай буржуазіі";
67 – "Схіленне замежнай дзяржавы да нападу на СССР ці да ўмяшання ў яго справы";
68 – "Шпіянаж";
69 – "Падрыў дзяржаўнай гаспадаркі";
70 – "Тэрарыстычны акт";
71 – "Разбурэнне ці пашкоджанне дзяржаўнай маёмасці";
72 – "Прапаганда і агітацыя супраць савецкай улады";
73 – "Неданясенне";
74 – "Дзейнасць пры царскім ладзе і контррэваліцыйных урадах";
75 – "Сабатаж";
76 – "Удзел у антысавецкіх арганізацыях".

Статыстычны аналіз[2] крымінальных справаў паказвае, што ў БССР пад час ажыццяўлення рэпрэсіяў найбольш часта выкарыстоўвалі абвінавачанні «антысавецкай прапагандзе і агітацыі» (арт. 72) – 38,77 %; потым ідзе «шпіянаж» (арт. 68) – 38,04 %; "удзел у антысавецкіх арганізацыях" (арт. 76) – 28,94 %.

Крымінальныя Кодэксы РСФСР 1922 г. і БССР 1928 г. "стваралі юрыдычную абалонку" палітычных рэпрэсіяў. Але апагеем рэпрэсіяў можна назваць палітыку савецкай улады ў дачыненні да вёскі ў 1930-х гадоў, гэтая палітыка была па-сутнасці вайною супраць сялянства. Гістарыяграфія праблемаў калектывізацыі і рэпрэсіяў супраць сялянства ўжо даволі вялікая[3]. У нашым зборніку мы публікуем толькі адзін, раней сакрэтны, дакумент на гэтую тэму – Пастанову Палітбюро ЦК ВКП(б) ад 30 студзеня 1930 г. "Аб мерапрыемствах па ліквідацыі кулацкіх гаспадарак у раёнах суцэльнай калектывізацыі". Гэта абсалютна тэрарыстычны дакумент! Пастанова ілюструе прынцыпы палітыкі ўладаў супраць сялянства – канфіскацыі і высяленні. Закладаюцца адпаведныя планы. Што важна, тэрміны "рэпрэсіі" і "канцлагерь", як высвятляецца, былі службовымі тэрмінамі ЦК ВКП(б).

Дакладная колькасць рэпрэсаваных так і засталася для нас невядомаю. У гістарычнай публіцыстыцы і прэсе сустаркаюцца вельмі розныя ацэнкі. У 1993 г. на старонках штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" на гэтую тэму нават адбылася дыскусія. Анатоль Сарокін даў сваю ацэнку: "Лічба 3 міліёны жыхароў

---

[2] А д а м у ш к а У. І. *Палітычныя рэпрэсіі 20—50-х гадоў на Беларусі.* Мн., 1994. С. 12—13.

[3] Назавем тут толькі некаторыя працы: В р у б л е в с к и й А. П., П р о т ь к о Т. С. *Из истории репрессий против белорусского крестьянства 1929—1934 гг.* Мн., 1992; Тацяна П р о ц ь к а. *Вынішчэньне сялянства: Вёска Ўсходняй Беларусі пад цяжарам бальшавіцкіх рэпрэсіяў 30-х гадоў.* Мн.: Архіў Найноўшае Гісторыі, 1998; Diana S i e b e r t. *Bäuerliche Alltagsstrategien in der Belarussischen SSR (1921—1941). Der Zerstörung patriarchalischer Familienwirtschaft.* Stutgart: Franz Steiner Verlag, 1998.

беларускай вёскі – ахвяраў савецкага таталітарнага рэжыму на пачатак 50-х гадоў… найбольш верагодная”[4]. У адказ Уладзімір Адамушка, апялюючы да захаваных і вывучаных дакументаў сцвярджаў, што судовымі і несудовымі органамі паводле палітычных матываў было рэпрэсавана больш за 250 тыс. чалавек; у адміністрацыйным парадку (раскулачванне, высяленне і г. д.) рэпрэсавана яшчэ 350 тыс. чалавек. “Такім чынам, у 1930—50-я гады… агульная лічба ахвяр палітычных рэпрэсій у Беларусі складае каля 600 тысяч чалавек”[5]. 600—700 тыс. чалавек як агульная лічба ахвяраў рэпрэсіяў 30-50-х гадоў у Беларусі унесеная і ў вучэбныя дапаможнікі і манаграфіі[6]. 500 тысяч з іх прыпадае на Ўсходнюю Белаурсь. Калі ўлічыць, што да Другой Сусветнай вайны ў ёй пражывала каля 5 млн. чалавек, то атрымліваецца, што тут быў рэпрэсаваны кожны дзясяты жыхар[7]. Трэба адзначыць, што існуе таксама методыка і пашыранай ацэнкі колькасці рэпрэсаваных, якая таксама грунтуецца на дакументальных матэрыялах: “Рэпрэсіі – гэта і звальненні з працы, і адмова ў прыёме на яе, і праслед сваякой, і пазбаўленне выбарчага права… А колькі было так званых паўторных рэпрэсіяў! У сукупнасці можна сцвярджаць, што ў Беларусі за гады савецкай улады пад рэпрэсіі падпалі каля 1 млн. 400 тыс. чалавек”[8].

Палітычныя рэпрэсіі 1960-1980-х гадоў вывучаныя значна менш, чым рэпрэсіі папярэдняга перыяду – 1930-1950-х гадоў. Гэтыя працэсы ўжо не мелі такога масавага характару, але палітычны складнік іх быў больш моцны і выразны ў параўнанні з ранейшым перыядам, дзе, апроч іншага, рэалізоўваліся сацыяльныя эксперыменты, а часам махавік рэпрэсіяў пачынаў дзейнічасць самастойна, і тады ўжо немагчыма знайсці нейкую логіку працэсу. У перыяд 1960-1980-х гадоў рэпрэсіі індывідуалізуюцца, працуе ўжо не канвеер, а сістэма адлоўлівання яўна незадаволеных рэчаіснасцю. З усёй статыстыкі тых гадоў нам вядомая толькі адна афіцыйная лічба – у Часовую камісію Вярхоўнага Савета Беларусі па расследаванню фактаў выкарыстання псіхіятрыі ў палітычных і рэпрэсіўных мэтах, створанаю ў чэрвені 1990 г., да пачатку 1993 г. паступіла звыш 150 заяваў[9]. Між тым, існавала заканадаўства, паводле якого ў гэтых новых умовах адбываліся палітычныя рэпрэсіі.

---

[4] А н а т о л ь С а р о к і н. Пад прэсам бальшавізму. Сутнасць і эвалюцыя рэпрэсіяў // *Літаратура і Мастацтва*. 1993, 16 ліпеня.

[5] А д а м у ш к а У. Колькі ж іх, ахвяр палітычных рэпрэсій // *Літаратура і Мастацтва*. 1993, 3 верасня.

[6] *Гісторыя Беларусі*: У 2 ч. Ч. 2. Люты 1917 г. – 1997. Вучэбны дапаможнік / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. Мн.: Універсітэцкае, 1998. С. 158.

[7] К а с ц ю к М. *Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі*. Мн., 2000. С. 176.

[8] Нюрнберг-2 состоялся в Литве [інтрэв’ю з Ігарам Кузняцовым] // *Народная Воля*. 2000, 12 ліпеня.

[9] М і р о н ч ы к У. Патрыятызм – галоўны стоўп // *Літаратура і мастацтва*. 1993, 5 сакавіка. Часам гэтую лічбу (150 заяваў ад ахвяраў карнай псіхіятрыі) недакладна атаясамляюць з усёй колькасці ахвяраў палітычных рэпрэсіяў 1960-1980-х гадоў, гл.: А д а м у ш к а У. Колькі ж іх, ахвяр палітычных рэпрэсій // *Літаратура і мастацтва*. 1993, 3 верасня.

Чарговы, больш мадэрнізаваны Крымінальны Кодэкс з'явіўся ў БССР у канцы 1960 г. – быў прыняты 29 снежня 1960 г., ўведзены ў дзеянне з 1 красавіка 1961 г. Асноўныя артыкулы гэтага Кодэксу, якія выкарыстоўваліся ў рэпрэсіўна-палітычных мэтах, былі наступныя:
67 – «Антысавецкая агітацыя і прапаганда» (мае генеалогію ў арт. 72 «прапаганда і агітацыя» Кодэкса 1928 г.);
69 – «Арганізацыйная дзейнасць і удзел у антысавецкіх арганізацыях» (развіўся з арт. 69 Кодэкса 1928 г.);
70 – «Злачынствы супраць іншай дзяржавы працоўных»;
186[1] – «Распаўсюджанне хлуслівых выдумак».
Фармулёўкі Крымінальнага Кодэкса 1961 г. па-ранейшаму стваралі вельмі шырокія магчымасці па інтэрпрытацыі яго артыкулаў. Тыя афіцыйныя каментарыі, які прапаноўваліся да Кодэкса, як высвятляецца, толькі пагаршалі становішча патэнцыйных падсудных. Калі ў самім артыкуле 67 увага канцэнтравалася на пісьмовай форме распаўсюджання інфармацыі, то каментарыі разглядалі ўжо форму і вуснага распаўсюджання. Самі разумееце, што пад такі артыкул Крымінальнага Кодэкса можна было "падвесці" вельмі многіх людзей. Цяпер я прыгадваю 1980-я гады і разумею, чаму слова "антысаветчык" нават на зыходзе савецкай эпохі мела такую эмацыйную афарбоўку.
У павеннай Беларусі паводле артыкула "агітацыя і прапаганда" (арт. 72 КК БССР 1928 г. і арт 67 КК БССР 1961 г.) былі асуджаныя крытык камуністычнай нацыянальнай палітыкі Браніслаў Ржэўскі (1957 г.) і крытык калгаснага ладу журналіст Фёдар Кардаш (1956 г.), праваабаронцы Аляксандр Доўбік (1958 г.) і Мікалай Лагодзіч (1963 г.), рэлігійны дысідэнт Эрнст Сабіла (1951 г.), распаўсюднікі ўлётак у абарону беларускай мовы браты Лявон і Міхась Белыя (1957 г.)[10]. Паводле аналагічнага артыкула Крымінальнага Кодэкса РСФСР (арт. 58[10] КК 1926 г. і арт. 70 КК 1960 г.) былі асуджаныя такія вядомыя потым у Беларуі людзі як будучы грэка-каталіцкі святар а. Віктар Данілаў (1948 г.) і крытык савецкай палітыкі адносна Праваслаўнай Царквы праваслаўны святар а. Уладзімір Русак (1986 г.)[11]. Вядома, гэта далёка не поўны спіс асуджаных паводле гэтага "знакамітага" арыткула. Але розная храналогія і вельмі розныя ўчынкі названых людзей сведчаць, наколькі адвольна інтэрпрытавалася "антысавецкая агітацыя і прапаганда". Вельмі тэматычна блізкім да гэтага артыкула быў артыкул 186[1] КК БССР 1961 г., які адпавядаў арт. 190[1] КК РСФСР. Менавіта з-за абвінавачванняў у «распаўсюджанне хлуслівых выдумак» быў асуджаны ў 1982 г. вядомы дысідэнт Міхась Кукабака[12].
Як мы ўжо адзначалі, нягледзячы на большую набліжанасць да нас у часе падзеяў 1950—1980 гадоў, тэма палітычнага пераследу таго

[10] Падрабязней глядзі: *Дэмакратычная апазыцыя Беларусі: 1956-1991. Пэрсанажы і кантэкст. Даведнік.* С. 17—18, 30—32, 40—41, 56—57, 74—79.
[11] Тамсама, с. 29—30, 77.
[12] Тамсама, с. 49—54.

перыяду вывучана гісторыкамі найменш – яшчэ жывыя выканаўцы палітычнага пераследу і зусім закрытыя на гэтую тэму архівы. Але ж і тыя падзеі цалкам адносяцца да праблематыкі рэпрэсіяў і рэабілітацыі.

## Механізм рэпрэсіяў

Рэгулярныя структурныя змены тых органах, якія займаліся ажыццяўленнем карнай палітыкі, могуць стварыць блытаніну пры вывучэнне працэса рэпрэсіяў і гэтым самым ускладніць падрыхтоўку неабходных дакументаў па рэабілітацыі. Таму варта храналагічна прасачыць эвалюцыю рэпрэсіўных органаў, адзначыўшы асноўныя этапы ў іх функцыянаванні.

Пачатак савецкага карнага механізму справядліва звязваюць з утварэннем 20 снежня 1917 г. Усерасійскай Надзвычайнай Камісіі па Барацьбе з Контррэвалюцыяй і Сабатажам, стаўшай шырока вядомай ва ўсім свеце праз яе расійскую абрэвіятуру – ВЧК (ці проста, ЧК). І ва ўрадавых дакументах, і ў афіцыйным друку сустракаюцца розныя варыянты назвы: "...па барацьбе з сабатажам і контррэвалюцыяй", "...з контррэвалюцыяй, сабатажам і залчынствамі па пасадзе", "...сабатажам і спекуляцыяй" і г. д. Сама Пастанова СНК РСФСР аб утварэнні ВЧК ніколі афіцыяльна не публікавалася. Нязменна кіраваў ЧК Фелікс Дзяржынскі. Праз паўгады (13 ліпеня 1918 г.) у ВЧК былі перададзеныя спецыяльныя вайсковыя адзінкі – Корпус войск ВЧК[13]. Пастановай СНК РСФСР ад 5 верасня 1918 г. «Аб чырвоным тэроры» ВЧК атрымала надзвычайныя паўнамоцтвы – гэты орган сканцэнтраваў у сваіх руках не толькі функцыі следства, але і суда. ВЧК карысталася правам непасрэдных рэпрэсіяў, уключна да растрэлу. А Пастановай Прэзідыума ЦВК РСФСР ад 11 красавіка 1919 г. «Аб лагерах прымусовай працы» было заканадаўча замацаванае існаванне сістэмы канцлагероў. З пераходам да Новай Эканамічнай Палітыкі пазасудовыя паўнамоцтвы ВЧК былі скарочаныя, але не адмененыя цалкам. З перамогай у Грамадзянскай вайне многія ў Камуністычнай партыі меркавалі, што патрэбы ў існаванні ВЧК ужо няма.

У лютым 1922 г. ВЧК было трансфармаванае ў Дзяржаўнае Палітычнае Упраўленне (ГПУ) пры Народным Камісарыяце Унутраніх Спраў РСФСР. Справы, якія вяло ГПУ, падлягалі разгляду ў судовым парадку, але ж за ГПУ было замацаванае права ажыццяўляць адміністрацыйныя (несудовыя) высылкі тэрмінам да трох год. Больш таго, 16 кастрычніка 1922 г. Пастановай ЦВК ГПУ зноў было надзеленае правам «несудовай расправы», у тым ліку і ў выглядзе расстрэла. Паступова ГПУ

[13] Падрабязней глядзі: Jan R u t k i e w i c z, Walerij N. K u l i k o w. *Wojska NKWD 1917—1946: Historia, organizacja, umundurowanie.* Warszawa: Barwa i Broń, 1998.

вярнула сабе большасць паўнамоцтваў ВЧК[14]. З прагалошаннем утварэння СССР было ўтваронае 15 лістапада 1923 г. Аб'яднанае Дзяржаўнае Палітычнае Упраўленне (ОГПУ) пра СНК СССР. У Беларусі таксама пры СНК БССР было ўтворанае ГПУ.
З пераходам да палітыкі суцэльнай калектывізацыі і паскоранай індустрыялізацыі ЦК ВКП(б) адчула неабходнасць цэнтралізацыі і ўзмацнення рэпрэсіўных органаў. У выніку, у снежні 1930 г. НКВД саюзных рэспублік былі зліквідаваныя, а ў снежні 1932 г. міліцыя выведзеная з падпарадкавання мясцовых уладаў і падначаленая непасрэдна ОГПУ СССР.
Чарговая важная рэарганізацыя адбываецца ў ліпені 1934 г., пасля смерці наркома ўнутраных спраў і начальніка ОГПУ Мянжынскага – ствараецца агульнасаюзны НКВД СССР, а ОГПУ пераўтвараецца ў Галоўнае Упраўленне Дзяржаўнай Бяспекі (ГУГБ) пры НКВД. Адпаведныя наркаматы ствараюцца ў саюзных рэспубліках. Упершыню ў гісторыі СССР падобны орган не надзяляецца афіцыйным правам пазасудовых расстрэлаў. Але ці былі ўжо тады ў СССР суддзі, якія б не выканалі жаданняў партыйнай вярхушкі? Злавесная слава "ЧК—ГПУ—ОГПУ" перайшла не на ГУГБ, а на НКВД.
Усе гэтыя структурныя змены закранулі таксама сістэму лагяроў. У красавіку 1930 г. прымаецца новае Палажэнне аб ИТЛ. Цяпер усе асуджаныя на тры гады і болей накіроўваюцца менавіта туды. А ў 1934 г., з утварэннем саюзнага НКВД, арганізуецца і Галоўнае Упраўленне Папраўча-Працоўных Лагяроў і Працоўных Пасяленняў – знакаміты ГУЛАГ, які пераўтвараецца, апроч іншага, у магутны трэст па забеспячэнню сацыялістычнай індустрыі таннай працоўнай сілай.
У канцы 1920-х гадоў судовая сістэма, створаная яшчэ Уладзімірам Леніным, пачала не спраўляцца з валам рэпрэсіўных спраў. Выхад быў знойдзены ў скарачэнні самой судовай практыкі, у пашырэнне пазасудовых функцыяў картных орагнаў. Са стварэннем НКВД СССР, у тым жа ліпені 1934 г., была створаная і Асобая нарада, якой прадаставілі права "прымяняць у адміністрацыйным парадку высылку, ссылку, заключэнне ў папраўча-працоўныя лагеры на тэрмін да пяці год і высылку па-за межы Саюза ССР"[15]. Пастановай ЦВК і СНК СССР ад 5 лістапада 1934 г. "Аб Асобай Нарадзе пры Народным Камісары ўнутраных спраў Союза ССР" быў вызначаны склад гэтага органа: наркам унутраных спраў, яго намеснікі, начальнік Галоўнага Упраўлення Міліцыі, упаўнаважаны НКВД па РСФСР, а таксама наркам унутраных спраў саюзнай рэспублікі, на тэрыторыі якой узнікла справа. Фактычна Асобая нарада – гэта завочны адміністрацыйны суд органаў дзяржбяспекі. Следчыя органы дзяржбяспекі

[14] Гэты працэс прааналізаваны: Christopher A n d r e w, Oleg G o r d i j e w s k i. *KGB*. Warszawa: Bellona, 1997 (пераклад з выдання: Christopher A n d r e w, Oleg G o r d i e v s k y. *KGB: The Inside Story of its Foreign Operations from Lenin to Gorbachev*). S. 64—65.
[15] *Собрание законов и распоряжений Рабоче-крестьянского правительства СССР.* М., 1934, № 36, ст. 283.

накіроўвалі ў Асобую нараду тыя справы, па якім нават савецкі суд паводле фармальных меркаванняў не мог вынесці абвінавачвання. Невядомы ніводны выпадак адмены Асобай нарадаю свайго ж рашэння. Таксама гэтыя рашэнні як пазасудовыя не маглі быць перагледжанымі судовым іці пракурорскімі інстанцыямі. Таксама ні ЦК, ні ЦВК ніколі не адмянялі пастаноў Асобай нарады.

Чаму мы надаем такую ўвагу пазасудовым рашэнням, калі само савецкае права той эпохі мела дактрынальны характар ды грунтавалася на канцэпцыі класавага вынішчэння? Сапраўды, сама юрыдычная сістэма СССР і БССР працавала на справу рэпрэсіяў, але з'яўленне пазасудовых органаў яшчэ больш абесцэнівала чалавечае жыццё, ставіла яго ў большую залежнасць ад выпадка, антыпатыі, памылкі. Усё гэта толькі раскручвала махавікі рэпрэсіяў.

Між тым, паходжанне так шырока вядомых па трыццатых гадах "троек" застаецца да канца не высветленым. Распаўсюджанае меркаванне, што ўтварэнне "пяцёрак", "троек", "двоек" і г. д. звязанае з своеасаблівай рэдукцыяй Асобай нарады, калі яна пачала дзейнічаць не ў поўным складзе[16]. Беларускі даследчык Уладзімір Адамушка звяртае ўвагу на тое, што ўжо ў Дэкрэце СНК РСФСР ад 26 студзеня 1918 г. "Аб Рэвалюцыйных трыбуналах друку" было заяўлена: "...засноўваюцца следчыя камісіі ў складзе трох асоб"[17]. Зразумела, што сама канцэпцыя пазасудовых рэпрэсіяў, рашэнне па якіх можа прымаць вельмі абмежаваны склад людзей, была сфармуляваная ў першыя дні савецкай улады, а далей яна была развітая ўжо ў дачыненні да канкрэтных органаў. Цыркулярамі ОГПУ ад 29 кастрычніка 1929 г. і ад 8 красавіка 1931 г. "тройкі" ўтвараюцца ў цэнтральным апараце НКВД дзеля папярэдняга разгляду следчых спраў і наступнага іх дакладу на пасяджэннях Калегіі і Асобнай нарады[18]. Загадам старшыні ОГПУ ад 2 лютага 1930 г. фармуюцца "тройкі" пры паўнамоцных прадстаўніках ОГПУ у краях і абласцях. 9 лютага 1933 г. Палітбюро ЦК КП(б)Б дало права "тройцы" паўнамоцнага прадстаўніка ОГПУ ў БССР прымяняць расстрэл па справах контррэвалюцыйных арганізацыяў і груповак. Загадам наркама унутраных спраў СССР ад 27 мая 1935 г. ствараюцца "тройкі" пры рэспубліканскіх, абласных, краявых НКВД – Упраўленнях НКВД. Узначальваў "тройку" кіраўнік органа НКВД (у рэспубліцы – наркам); у яе склад уваходзілі таксама кіраўнік партыйнага органа канкрэтнай тэрыторыі і яе пракурор. У 1937 г. у Беларусі ў "тройку" ўваходзілі: наркам Б. Берман, сакратар ЦК КП(б)Б У. Патапейка і намеснік пракурора БССР па спецсправах К. Сільвестраў; у 1938 г.: наркам А. Наседкін, першы сакратар ЦК

[16] *Нарысы гісторыі Беларусі.* У 2 ч. Ч. 2. Мн.: Беларусь, 1995. С. 204.
[17] А д а м у ш к а У. І. *Палітычныя рэпрэсіі 20—50-х гадоў на Беларусі.* С. 20.
[18] *Канвэер сьмерці: Дакумэнты. Сьведчаньні. Успаміны* / Укладальнік і аўтар камэнтароў Ігар Кузьняцоў. Мн.: Архіў Найноўшае Гісторыі, 1997. С. 16—17.

КП(б)Б П. Панамарэнка, пракурор БССР Я. Новік[19]. У 1934 г. у СССР быў утвораны яшчэ адзін пазасудовы орган – "двойка", якая фармавалася як Камісія НКВД СССР і Пракуратуры СССР.
Менавіта ў пазасудовым парадку з прымяненнем вышэйшэй меры пакарання, паводле прапановы сакратара ЦК ВКП(б) Л. Кагановіча, разглядаліся справы асобаў, якіх абвінавачвалі ў палітычных злачынствах. Але і гэтая практыка была "ўдасканаленая" – паводле прапановы тагачаснага старшыні СНК СССР В. Молатава пакаранні пачалі праводзіцца па спісах.
Дзеля ўмацавання ролі НКВД для супрацоўнікаў гэтага органа былі ўведзеныя вайсковыя чыны на тры ступені вышэйшыя, чым у Чырвонай Арміі; аклады іх грашовага ўтрымання адразу былі павялічаныя ў чатыры разы; за правядзенне свах акцыяў энкавэдысты маглі атрымліваць баявыя ўзнагароды. Тады ж былі створаныя спецаддзелы на ўсіх буйных прадпрыемствах і ў навучальных установах.
У 1938 г. Іосіф Сталін змяніў сваю тактыку і вырашыў паўстрымаць пашырэнне бескантрольнасці сваёй карнай гвардыі. 7 лістапада 1938 г. СНК СССР і ЦК ВКП(б) прынялі Пастанову "Аб арыштах, пракурорскім наглядзе і вядзенні следства", у выкананні якой наркам НКВД 26 лістапада 1938 г. выдаў загад пра скасаванне пры НКВД "троек" і "двоек". Асобная нарада працягвала сваю дзейнасць да 1 верасня 1953 г.
Пры далейшых трансфармацыях 3 лютага 1941 ГУГБ было пераўтворанае ў Народны Камісарыят Дзяржаўнай Бяспекі (НКГБ). Таксама былі створаныя НКГБ саюзных рэспублік. Але ўжо 20 ліпеня гэты камісарыят зліквідавалі і дзярбяспеку зноў як ГКГБ далучылі да НКВД. У красавіку 1943 г. зноў аднавілі НКГБ, які 15 сакавіка 1946 г. (як і ўсе іншыя цэнтральныя выканаўчыя органы) стаў Міністэрствам Дзяржаўнай Бяспекі (МГБ). 15 сакавіка 1953 г., пасля смерці Сталіна, МГБ ліквідуюць, а яго функцыі перадаюць Міністэрству Унутраных Спраў (МВД). Але праз год, 13 сакавіка 1954 г. дзяржбяспеку канчаткова аднаўляюць як самастойны орган – Камітэт Дзяржаўнай Бяспекі. У КГБ былі адабраныя тыя супрацоўнікі МГБ, якіх новае партыйнае кіраўніцтва пасля стараннай праверкі палічыла надзейным. Сетка КГБ ахоплівае ўсе сферы жыцця і ўсю тэрыторыю велізарнай дзяржавы – спрэс да раёну, а таксама ўсе савецкія ўстановы за мяжою. Менавіта з 1954 г. абрэвіятура КГБ замацоўваецца ў свядомасці людзей як галоўны рэпрэсіўны орган СССР.

[19] А д а м у ш к а У. І. *Палітычныя рэпрэсіі 20—50-х гадоў на Беларусі.* С. 20.

**Схема эвалюцыі КГБ**

20 снежня 1917 ВЧК
↓
6 лютага 1922 Далучэнне да НКВД як ГПУ
↓
15 лістапада 1923 ОГПУ пры СНК СССР, ГПУ БССР і іншых саюзных рэспублік
↓
10 ліпеня 1934 Новае далучэнне да НКВД як ГУГБ, утварэнне ГУЛАГу, НКВД БССР і іншых саюзных рэспублік
↓
3 лютага 1941 НКГБ СССР, БССР і іншых саюзных рэспублік
↓
20 ліпеня 1941 Чарговае далучэнне да НКВД як ГУГБ
↓
Красавік 1943 НКГБ СССР, БССР і іншых саюзных рэспублік
↓
15 сакавіка 1946 МГБ СССР, БССР і іншых саюзных рэспублік
↓
15 сакавіка 1953 Аб'яднанне з МВД і ўтварэнне пашыранага МВД СССР, а таксама БССР і іншых саюзных рэспублік
↓
13 сакавікв 1954 КГБ СССР, БССР і іншых саюзных рэспублік

**Працэсы рэабілітацыі ў СССР і ў Беларускай ССР у 1950-х і ў другой палове 1980-х гадоў**

Трэба адзначыць, што і ў 1930-х гадах, пасля чарговых кампаніяў пашырэння тэрору наступалі перыяды пакарання тых, хто папярэдню праводзіў гэтыя рэпрэсіі. І ў першых выпадках, калі карны механізм актывізоўваўся, і ў другіх выпадках, калі знішчалі выканаўцаў рэпрэсіўных загадаў, каманды сыходзілі з адзінага цэнтру кіравання сістэмаю, а чаргаванне стратэгіі, меркавалася, надае дынамічную раўнавагу таталітарызму. Тут варта прыгадаць, як пасля студзеньскага 1938 г. Пленума ЦК ВКП(б), які разглядаў пытанне *“Аб памылках партарганізацыяў пры выключэнні камуністаў з партыі, аб фармальна-бюракратычных адносінах да апеляцыяў выключаных з ВКП(б) і аб мерах па пераадоленню гэтых недахопаў”* размах рэпрэсіяў паменшыўся. З прыходам на пасаду наркама ўнутраных спраў Лаўрэнція Берыі распачалося пакаранне тых, хто здзейсняў масавы тэрор у папярэднія гады. У лістападзе 1938 г. СНК СССР і ЦК ВКП(б) прыняў асобную пастанову *“Аб арыштах, пракурорскім наглядзе і вядзенні следства”*, паводле якой шэраг супрацоўнікаў ОГПУ—НКВД, у першую чаргу следчыя, былі прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці за парушэнне законнасці. У гэтыя розныя перыяды

“адліваў” і “прыліваў” да 1954 г. было разгледжана 29 тыс. спраў і рэабілітавана звыш 35 тыс. чалавек[20].

Працэс рэабілітацыі ў Беларусі ў 1950-х і ў другой палове 1980-х быў цалкам звязаны і вызначаўся дырэктывамі, якія сыходзілі з Масквы. Разумеючы, што рэальная ўлада тады належыла КПСС, тут варта прыгадаць дакументы гэтай партыйна-уладнай арганізацыі.

Пасля смерці Іосіфа Сталіна ў нетрах ЦК КПСС распачалася барацьба за ўладу, у чым прыдалася і тэма рэпрэсіяў[21]. Мяркуецца, што пачатак адыходу ад практыкі масавых рэпрэсіяў звязаны з ліпеньскім 1953 г. Пленумам ЦК КПСС, які працягваўся беспрэцендентна доўгі тэрмін – з 2 па 7 ліпеня. Ад імя Прэзідыума ЦК выступіў Г. Маленкоў з дакладам *“Аб злачынных антыпартыйных і дзяржаўных дзеяннях Л. П. Берыі”*. Гэта быў вельмі ўдалы прапагандысцкі ход – перанесці адказнасць усёй сістэмы персанальна на аднаго Лаўрэнція Берыю. Але на Пленуме таксама было ўзнятыя пытанні пра культ асобы Сталіна і пра неабходнасць рэабілітацыі грамадзянаў, рэпрэсаваных у 1930-я гады. Менавіта пасля гэтага Пленума была распачатая праца па перагляду спраў на асобаў, асуджаных па палітычных матывах.

Распачалася і адпаведная заканадаўчая праца. 1 верасня 1953 г. быў прыняты Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР *“Аб ліквідацыі Асобай нарады пры міністры ўнутраных спраў СССР”*. Такім чынам, ліквідоўваўся орган, які быў правадніком пазасудовых рэпрэсіяў і надалей пазбавіць чалавека свабоды можна было толькі праз суд. Яшчэ праз тыдзень, 8 верасня таксама Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР была адмененая забароны амністыяў да асобаў, які былі асуджаныя за раскраданне сацыялістычнай уласнасці і за спекуляцыю – за злачынствы, рэгламентаваныя пастановамі ЦВК і СНК СССР ад 7 і 22 жніўня 1932 г. Таксама была адмененая крымінальная адказнасць за парушэнні працоўнага рэжыму – вельмі строгія законы на гэты конт былі прынятыя перад самой вайной і ў першыя яе гады.

Адзін з асноўных тагачасных дакументаў КПСС, які спрычыніўся да пачатку працэсу масавай рэабілітацыі, гэта Пастанова ЦК КПСС ад 4 мая 1954 г. *“Аб пераглядзе спраў на асоб, асуджаных за контррэвалюцыйныя злачынствы, якія ўтрымліваюцца ў лагерах, калоніях і турмах МУС і знаходзяцца ў ссылцы і на пасяленні”*[22]. Пастанова Савета Міністраў СССР ад 8 верасня 1955 г. “Аб працоўным стажы, працаўладкаванні і пенсійным забеспячэнні

---

[20] А д а м у ш к а У. І. *Палітычныя рэпрэсіі 20—50-х гадоў на Беларусі.* С. 139.

[21] Само паведамленне пра смерць Сталіна выклікала хваляванні сярод зняволеных у лягерах. Яркай падзеяй тут было паўстанне мая-чэрвеня 1953 г. у Гарлагу, апісанае ў кнізе ўдзельніка падзеяў: Р ы г о р К л и м о в и ч. *Конец Горлага.* Мн.: Архіў Найноўшае Гісторыі, 1999.

[22] Паказальна, што ў пазнейшых выданнях «*КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК*» гэтая Пастанова не публікавалася. Таксама пра ліпеньскі 1953 г. публікавалася толькі кароткае Інфармацыйнае паведамленне (гл. т. 6. М., 1971. С. 384).

грамадзян, неабгрунтавана прыцягнутых да крымінальнай адказнасці і ў далейшым рэабілітаваных" ставіла на мэце ў некаторай ступені аднавіць маёмасныя правы рэпрэсаваных. Паводле гэтай Пастановы час знаходжання ў зняволенні і ў ссылцы залічваўся ў агульны працоўны стаж (што ва ўмовах СССР было немалаважным).

КПСС стала рыхтавацца да рэвізіі практыкі рэпрэсіяў ва ўласных шэрагах. 31 снежня 1956 г., напярэдадні ХХ з'езда, Прэзідыум ЦК утварыў Камісію для вывучэння матэрыялаў аб масавых рэпрэсіях членаў і кандыдатаў у члены ЦК ВКП(б), абраных XVII з'ездам. Два месяцы Камісія знаёмілася з дакументамі найперш НКВД. Матэрыялы працы Камісіі сталі асновай для даклада Мікіты Хрушчова на ХХ з'ездзе КПСС. 13 лютага Прэзідыум ЦК прыняў пастанову аб правядзенні закрытага пасяджэння з'езда і выступленні на ім з дакладам М. Хрушчова.

Гэты даклад, з якім Мікіта Хрушчоў выступіў 25 лютага 1956 г. [23], стаў знакамітым і адыграл выключную ролю ў працэсе рэабілітацыі. На з'ездзе была прынятая адпаведная рэзалюцыя, а ўжо 19 сакавіка 1956 г. выйшла Пастанова ЦК КПСС *"Аб разглядзе спраў на асобаў, якія адбываюць пакаранне за палітычныя, службовыя і гаспадарчыя злачынствы"*, якая замацавала адзін прынцыповы працэдурны момант – перагляд справаў рэпрэсаваных можна было праводзіць у пазасудовым парадку спецыяльнымі камісіямі, створаных з ліку партыйных і савецкіх работнікаў з удзелам спецыялістаў суда, пракуратуры, МУС і КГБ. Заканадаўчае афармленне названая пастанова знайшла ў аднайменным Указе Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1956 г.[24] Але ва Указе было важнае дапаўненне – гэтыя камісіі артымалі права датэрмінова вызваляць вязняў. Паўнамоцтвы камісіяў былі пацверджаны Пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР *"Аб парадку перагляду судовымі органамі крымінальных справаў на асуджаных, у адносінах да якіх былі прынятыя рашэнні камісіяў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР"*. Прынцыповае палажэнне гэтай Пастановы – не падлягалі перагляду ў судовым парадку справы на грамадзянаў, якія былі прызнаныя камісіямі Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР неабгрунтавана асуджанымі. Спрэс да другой паловы 1980-х гадоў гэтыя заканадаўчыя і падзаконныя акты вызначалі прававую базу працэса рэабілітацыі.

30 чэрвеня 1956 г. і Пастанова ЦК КПСС *"Пра пераадоленне культа асобы і яго наступстваў"*[25]. У 1956—1961 гг. Камітэт партыйнага кантролю пры ЦК КПСС рабіў рэгулярныя справаздачы, дзе аналізаваўся працэс рэабілітацыі. Між тым, у шматтамовым выданні *«КПБ в резолюциях и решениях съездов и*

---

[23] Гл. публікацыю тэксту дакладу: *Реабилитация: Политические процессы 30—50-х годов.* М., 1991. С. 19—67.

[24] *Сборник законодательных актов и документов.* М., 1989. Л. 18.

[25] *КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК.* Т. 7. М., 1971. С. 199—218.

*пленумов ЦК»* за гэты ж перыяд вы не знойдзеце падобных матэрыялаў, якія хоць бы пераказвалі сутнасці маскоўскіх дакументаў. Асобна трэба заўважыць, што ў 1950-х гадах яшчэ не казалі пра ахвяраў масавых рэпрэсіяў, пастанова Савета Міністраў СССР гаворыць пра грамадзянаў, "неабгрунтавана прыцягнутых да крымінальнай адказнасці і ў далейшым рэабілітаваных", а ў якасці галоўнага прадмету ўвагі ў дакументах КПСС вызначаецца культ асобы Сталіна.

У Беларусі Вярхоўны суд БССР пачаў перагляд справаў асуджаных паводле артыкулаў 63—76 Крымінальнага кодэкса БССР і артыкула 58 КК РСФСР са студзеня 1954 г. Асноўны аб'ём гэтых справаў быў перагледжаны ў другой палове 1956 – першай палове 1961 г. За гэты час было разгледжана звыш 30 тыс. спраў, якія тычыліся больш за 50 тыс. чалавек; каля 40 тыс. з іх было рэабілітавана[26]. Справамі рэабілітацыі займалася таксама Ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР, якая разам з ваеннымі трыбуналамі акругаў рэабілітавала па СССР звыш 300 тыс. чалавек, у тым ліку звыш 20 тыс. жыхароў Беларусі. Адзначым, што на працягу 1953—1961 гг. былі рэабілітаваныя пераважна прадстаўнікі ўладнай эліты савецкай дзяржавы і ваеннаслужачых. Сваякі соцен тысячаў сялянаў мусілі былі чакаць яшчэ звыш 30 год таго моманту, калі ўлады заявяць, што іх родныя не былі злачынцамі.

Трэба прызнаць, што для вышэйшага кіраўніцтва СССР працэс рэабілітацыі не быў беспраблемным. З аднаго боку самі ініцыятары перагляду курсу мелі за сваімі плячыма цяжар адказнасці за ўдзел у рэпрэсіях. З іншага боку, тэма рэпрэсіяў выкарыстоўвалася ва ўнутрыпартыйнай барацьбе. У чэрвені 1957 г. на пасяджэнні Прызідыума ЦК КПСС была зробленая спроба зняць з пасады Мікіту Хрушчова. Матывацыя – Першы сакратар задалёка зайшоў у крытыцы культу асобы і гэтым самым нанёс страты прэстыжу КПСС і СССР як унутры краіны, так і на міжнароднай арэне. Але на чэрвеньскім 1957 г. пленуме ЦК М. Хрушчоў устаяў, а антыпартыйнай была названая група Малянкова, Молатава, Кагановіча, а таксама Шапілаў, якія і склалі змову і дамагаліся перагляду рашэнняў XX з'езда КПСС[27]. Ужо на XXII з'ездзе КПСС (17—31 кастрычніка 1961) Хрушчоў умацаваў свае пазіцыі, цела Сталіна было вынесенае з маўзалея[28], па ўсяму СССР распачаўся дэмантаж яго помнікаў. Але, падобна, гэты быў пік антырэпрэсіўнай актыўнасці лідэраў КПСС. Як вядома, у 1960-х – першай палове 1980-х гадоў працэсы рэабілітацыі былі прыпыненыя.

Ёсць яшчэ адная рыса, якая характарызуе непаслядоўнасць тагачаснай "адлігі" – утойванне інфармацыі. Амаль да самага канца існавання савецкай улады пад забаронаю заставаліся праўдзівыя звесткі пра растраляных паводле рашэнняў несудовых органаў (Асобай нарады, "троек", "двоек", Камісіі НКВД, Пракурора

---

[26] А д а м у ш к а У. І. *Палітычныя рэпрэсіі...* С. 142.
[27] *КПСС в резолюциях...* Т. 7. С. 267—273.
[28] *КПСС в резолюциях...* Т. 8. М., 1972. С. 325.

СССР і г.д.)[29]. Найранейшы адпаведны загад НКВД быў выдадзены ў 1939 г. – на запыты сваякоў растраляных трэба было адказваць, што ўсе гэтыя людзі атрымалі 10 год ИТЛ без права перапіскі. Увосень 1945 г. загад быў скарэктаваны – заяўляльнікам мусілі цяпер адказваць, што іх сваякі памерлі ў месцах пазбаўлення свабоды. Але з пачаткам працэсу рэабілітацыі імкліва сталі накопліванца пытанні і разначытанні ў дакументах; КГБ пачало звяртацца ў ЦК КПСС з запытам, як паводзіць сябе далей у такой сітуацыі. 18 жніўня 1958 г. Прэзідыум ЦК КПСС прыняў пастанову, на аснове якой 25 жніўня старшыня КГБ СССР І. Сяроў падпісаў указанне – сваякам расстраляных трэба было адказваць, што іх родныя атрымалі 10 год ИТЛ і памерлі там. Калі ж паўставалі маёмасныя і прававыя пытанні, то прадпісвалася рэгістраваць смерць у органах ЗАГСа па месцы жыхарства рэпрэсаванага да арышту ды выдаваць пасведчанне аб смерці. Але і тут дата смерці вызначалася супрацоўнікамі КГБ адвольна -– у межах 10 год з моманту арышту. Выдуманай павінна была быць і прычына смерці. У 1958 г. была знойдзеная і адпаведная матывацыя такіх дзеянняў: у перыяд масавых рэпрэсіяў неабгрунтавана была асуджаная вялікая колькасць грамадзянаў і паведамленне аб спраўдным лёсе грамадзянаў мажа адмоўна паўплываць на стан іх сем'яў; апроч таго, гэтую інфармацыю маглі выкарыстаць варожыя сілы.
На працягу 1954—1961 гг. з усіх перагледжаных справаў несудова рэпрэсаваных было рэабілітавана каля 60 %. Праблема ўскладнялася яшчэ і тым, што ваенная калегія Вярхоўнага Суда СССР называла таксама няпраўдзівыя даты гібелі. Колькасць сфальшаванай інфармацыі павялічвалася. У снежні 1962 г. старшыня КГБ У. Сямічасны прапанаваў перагледзіць гэтую практыку[30]. І пасля ўхвалення Палітбюро ЦК КПСС з 1963 г. сваякам рэпрэсаваных пачалі паведамляць праўдзівыя звесткі, а пад час рэгістрацыі ў аддзелах ЗАГСа ўказвалася рэальная дата расстрэлу. Але ж тым, хто атрымліваў паведамленні да 1963 г., інфармацыя не была скарэктаваная. Гэтае правіла дзейнічала да канца 1980-х гадоў і было адмененае загадам па КГБ СССР толькі 30 верасня 1989 г.

На другую палову 1980-х увогуле прыпадае новы этап маштабнай рэабілітацыі. Гэтым разам санкцыю дала таксама вярхушка КПСС. 28 верасня 1987 г. Палітбюро ЦК утварыла Камісію па дадатковаму вывучэнню матэрыялаў, звязаных з рэпрэсіямі, якія мелі месца ў перыяд 30—40-х і пачатку 50-х гадоў, якую ўзначаліў М. Саломенцаў. У ліпені 1988 г. было ўжо прынятае рашэнне пра ўзвядзенне помніка ахвярам. Пракуратуры СССР было даручана перагледзець усе справы рэпрэсаваных у 30—50-я гады,

[29] Гл. падрабязней гэты сюжэт: И г о р ь К у з н е ц о в. Кто скрывал правду о злодеяниях // *Советская Белоруссия.* 1997, 6 сентября; К а с ц ю к М. *Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі.* С. 276—277.
[30] Тэкст дакладной запіскі У. Сямічаснага апублікваны: *Канвэер сьмерці.* С. 152—155.

незалежна ад наяўнасці заяваў і скаргаў, а судам трэба было разглядаць гэтыя справы ў першую чаргу. Надалей справа рэабілітацыі ўсё ў большай ступені трапляла ў кампетэнцыю дзяржаўных органаў. Вельмі важнае рашэнне 16 студзеня 1989 г. прыняў Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР на чале з Міхаілам Гарбачовым – адмяняліся ўсе несудовыя рэпрэсіўныя рашэнні і гармадзяне, якія пацярпелі з-за гэтых рашэнняў, абвяшчаліся рэабілітаванымі. Тады ж мясцовыя Савета пачалі аказваць дапамогу пацярпелым ад рэпрэсіяў. У жніўні 1990 г. Міхаіл Гарбачоў, ужо як прэзідэнт СССР, выдаў указ, дзе была дадзена маральна-прававая ацэнка рэпрэсіям і асобна падкрэсліваўся трагічны лёс сялянства ў часы тэрору.

Беларускі кіруючы клас вымушаны быў так ці інакш падхопліваць павевы, якія даносіліся з Масквы. Палітбюро ЦК КПСС утварыла Камісію *"Па дадатковаму вывучэнню матэрыялаў, звязаных з рэпрэсіямі, якія мелі месца ў перыяд 30—40-х і пачатку 50-х гадоў"* у верасні 1987 г., а ЦК КПБ утварыла Камісію з такой жа назваю толькі ў лістападзе 1988 г. Палітбюро ЦК КПСС прыняло пастанову *"Аб узвядзенні помніка ахвярам беззаконій і рэпрэсій"* у ліпені 1988 г., Савет Міністраў БССР выдала пастанову *"Аб увекавечанні памяці ахвяр масавых рэпрэсій 1937—1941 гадоў у лясным масіве Курапаты"* у студзені 1989 г. Зрэшты, апошняя пастанова так і не была выкананая.
Звернем таксама ўвагу на храналогію. У дакументах КПСС 1988—1990 гг. называюцца рэпрэсіі "перыяду 30—40-х і пачатку 50-х гадоў", і толькі ў жнівеньскім 1990 г. Указе Прэзідэнта СССР Міхаіла Гарбачова было заяўлена пра "палітычныя рэпрэсіі 20—50-х гадоў". Гэтая храналогія была паўтораная ў Пастанове Вярхоўнага Савету БССР 21 снежня 1990 г. Беларускія ўлады здолелі даць больш поўнае акрэсленне рэпрэсіўнаму перыяду ўжо ў лістападзе 1991 г., калі былі ўнесеныя змены ў назву Камісіі пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь па аказанню садзеяння ў забеспячэнні правоў ахвяраў палітычных рэпрэсіяў 20–80-х гадоў і ўвекавечанні іх памяці. З канца 1990 г. пачало фармавацца ўласна беларускае заканадаўства па рэабілітацыі ахвяраў рэпрэсіяў.

## Працэсы рэабілітацыі ў Беларусі ў 1990-х гадах

Беларускае заканадаўства вызначылася выразнаю характарыстыкаю катэгорыяў асобаў, якія падпадаюць пад рэабілітацыю. Паводле Пастановы Вярхоўнага Савета БССР ад 29 снежня 1990 г. такімі з'яўляюцца:
а) асобы, незаконна асуджаные судамі па абвінавачванню ў здзяйсненні дзяржаўных (контррэвалюцыйных) злачынстваў;
б) асобы, рэпрэсаваныя паводле рашэнняў пазасудовых органаў: калегіяў і асобых нарадаў ВЧК, ГПУ – ОГП, НКВД, МГБ, «двоек», «троек» ГПУ, УНКВД – НКВД;

в) сяляне, члены іх сямей і іншыя грамадзяне, незаконна адпраўленыў у ссылку, высылку, накіраваныя на спецпасяленне, удаленню за межы Беларускай ССР у адміністратыўным парадку.

Гэтай жа Пастановай пракуроры Беларусі абавязаны былі разглядзець "усе справы з выракамі судоў за перыяд 20–50-х гадоў аб дзяржаўных (контррэвалюцыйных) злачынствах".

У лістападзе 1991 г. Пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь катэгорыі асобаў, якія могуць прэтэндаваць на кампенсацыю стратаў, былі ўдакладненыя: "...а таксама сяляне, у тым ліку прызнаныя кулакамі, асуджаныя за неўплату павышаных падаткаў і адмову ад выканання павіннасцяў і работ..." Пра інтарэсы рэпрэсаваных сялянаў зноў было ўказана ў раздзеле аб працэдуры кампенсацыі: "У такім жа парадку разглядаюцца і вырашаюцца заявы грамадзянаў аб кампенсацыі стратаў, у якіх у працэсе раскулачвання была канфіскаваная маёмасць, але самі яны падпалі пад высяленне па-за межы рэспублікі".

Пастанова ад 1 лістапада 1991 г. вельмі важная яшчэ і таму, што ў ёй юрыдычна былі замацаваныя такія катэгорыі рэпрэсаваных як ахвяры карнай псіхіятрыі і палітычныя вязьні перыяду 1960—1988 гг.: "...асобы, незаконна змешчаныя паводле рашэнняў судоў у псіхіятрычныя ўстановы на прымусовае лячэнне ў сувязі з узбуджэннем крымінальнай справы.

Рэабілітаваць асобаў, асуджаных у перыяд з 1960 па 1988 годы па палітычным матывам за злачынствы, адказнасць за якія была адмененая далейшым заканадаўствам..."

Пастанова ад 23 снежня 1991 г. прызнала "пацярпеўшымі ад палітычных рэпрэсіяў дзяцей, якія знаходзіліся ў месцах пазбаўлення волі, у ссылцы, высылцы, на спецпасяленні, у сувязі з рэпрэсіраваннем іх бацькоў". На гэтую катэгорыю людзей таксама былі распаўсюджаныя льготы, устаноўленыя для ахвяраў палітычных рэпрэсіяў. Пастановай ад 3 снежня 1993 г. прызнаваліся пацярпелымі ад палітычных рэпрэсіяў таксама дзеці, "якія засталіся сіротамі ў сувязі з рэпрэсіраваннем абодвух бацькоў", а 18 кастрычніка 1994 г. гэты спіс быў дапоўнены такой катэгорыяй, як "дзеці, муж (жонка) асобаў, растраляных або памерлых у месцах пазбаўлення свабоды і рэабілітаваных пасмяротна".

Як бачым, у першай палове 1990-х гадоў беларускі Заканадаўца вельмі актыўна і творча займаўся праблемамі палітычных рэпрэсіяў і рэабілітацыі. На працягу 1990-1994 гг. была прынята 24 нарматыўных дакументаў, які забяспечвалі працэс рэабілітацыі ў Беларусі. Парламент краіны выдаў 16 актаў, які закладалі юрыдычны падмурак працэса рэабілітацыі. У найбольш важныя тут *"Палажэнне аб парадку аднаўлення правоў грамадзянаў, пацярпелых ад рэпрэсіяў у 20-80-х гадах"* і Пастанову *"Аб парадку рэабілітацыі ахвяраў палітычных рэпрэсіяў 20-50-х гадоў у Рэспубліцы Беларусь"* Вярхоўны Савет уносіў праўкі і дапаўненні пяць разоў, прычым гэтыя праўкі пашыралі кола асобаў, якія падпадалі пад рэабілітацыю і маглі патрабаваь кампенсацыяў.

Таксама і Савет Міністраў (і Міністэрства фінансаў) зацвердзілі 8 актаў, накіраваныя на аказанне дапамогі рэпрэсаваным і кампенсацыю стратаў – у 1990 г. усё пачыналася з льготаў, а ў 1994 г. быў ужо акрэслены парадак вызначэння коштаў будынкаў, якія былі адабраныя ў грамадзянаў пад час рэпрэсіяў. Пад Пастановамі Вярхоўнага Савета Беларусі стаяць подпісы старшыняў – Мікалая Дземянцея, Станіслава Шушкевіча, Мечыслава Грыба. Пастановы Савета Міністраў падпісваў прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч.

Прынамсі, з боку парламента, дзяржава імкнулася ажыццяўляўся кантроль над выкананнем заканадаўчых актаў, якія рэгулявалі працэс рэабілітацыі: у снежні 1991 г. Вярхоўны Савет выдаў Пастанову пра выкананне гэтых законаў у Мінскай вобласці, а ў маі 1993 Прэзідыум Вярхоўнага Савета выдаў падобную Пастанову, у якой быў праведзены аналіз выканання заканадаўства ўжо па ўсёй Беларусі. З тэксту гэтых дакументаў вынікае, што Заканадаўца не быў цалкам задаволены выкананнем законаў у гэтай сферы – абодва разы праца характарызавалася як недастатковая. У 1991 г. яшчэ меркавалі, што рэабілітацыю можна завершыць "на працягу максімум 3 год" (Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 27.12.1991 г., № 1354—XII *«О ходе реализации в Минской области законодательных актов Республики Беларусь, регулирующих вопросы реабилитации жертв политических репрессий 20—80-х годов»*), але ў 1993 г. ужо канстатавалася, што "як вынік зацягвання рэабілітацыя грамадзянаў, рэпрэсаваных у судовым і адміністрацыйным парадку, ...можа быць завершаная ў тэрмін, устаноўлены па просьбе Савета Міністраў да 1996 г. уключна" (Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 24.05.1993 г., № 2320–XII *«О ходе исполнения законодательства о реабилитации жертв политических репрессий 20–80-х годов и восстановления их прав»*).

Застаецца ўражанне, што тэма Курапатаў свядома блакіравался і тады. У маі 1993 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета заяўляў, што "доўгі час у Савеце Міністраў не вырашаюцца пытанні аб вызначэнні статуса ляснога масіву Курапаты, яго падначаленасці, аб тэрмінах праектавання і ўзвядзення тут помніка ахвярам палітычных рэпрэсіяў".

Важна таксама ўзгадаць пра статыстыку рэабілітацыі. Вельмі абмежавана, але рэабілітацыя адбывалася і да 1954 г. – было разгледжана 29 тыс. спраў і рэабілітавана звыш 35 тыс. чалавек. Тады разгляд спраў адбываўся пераважна паводле заяваў сваякоў. На працягу 1956—1962 гг. у Беларусі было рэабілітавана паводле адных звестак 29 012 чалавек і ў партыйным парадку – каля 200 чалавек[31], паводле іншых звестак – каля 60 тыс. чалавек[32]. У Пастанове Сакратарыяту ЦК КПСС ад 7 ліпеня 1990 г. *"Аб ходзе*

[31] *Нарысы гісторыі Беларусі.* Ч. 2. Мн., 1995. С. 374; К а с ц ю к М. *Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі.* С. 267.
[32] А д а м у ш к а У. І. *Палітычныя рэпрэсіі...* С. 142

*выканання Пастаноў ЦК КПСС ад 11 ліпеня 1988 года і 5 студзеня 1989 года па пытанням рэабілітацыі асобаў, неабгрунтавана рэпрэсаваных у 30—40-х і ў пачатку 50-х гадоў"* было заяўлена, што ў судовым парадку ў Беларускай ССР рэабілітавана 53 513 чалавек[33]. У маі 1993 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларусі канстатаваў, што "ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у 1990—1992 гг. рэабілітавана больш за 37 тысяч грамадзянаў, незаконна рэпрэсаваных паводле палітычных матываў у судовым і адміністрацыйным парадку. Мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў вырашана больш за 10 тысяч заяваў рэабілітаваных грамадзянаў аб аднаўленні іх правоў. Прыкладна 2 тысячам рэабілітаваных выплачаны... кампенсацыі за час знаходжання ў месцах пазбаўлення свабоды". У 1993 г. было рэабілітавана яшчэ звыш 13 тыс. чалавек. Такім чынам, за чатыры гады рэалізацыі ўласна беларускага заканадаўства рэабілітацыі дамагліся 50 672 чалавекі, з іх 29 336 было рэабілітавана органамі ўнутраніх спраў, г. з. што ў адносінах да іх выкарыстоўваліся адміністрацыйныя метады рэпрэсіяў. У выніку, на працягу 1956—1994 гг. было рэабілітавана звыш 130 тыс. грамадзянаў Беларусі. Эксперты адзначаюць, што гэта 30 % ад агульнай колькасці жыхароў нашай краіны, рэпрэсаваных у 20—50-х гадах[34].

Пасля 1994 г. мы заўважаем зусім іншую тэндэнцыю ў заканадаўчым працэсе, які тычыцца рэабілітацыі – было прынята разам пяць дакументаў – адзін Закон, адзін Указ Прэзідэнта, тры дакументы Кабінета Міністраў. Гэта былі даволі партыкулярныя дакументы, за выняткам, бадай, Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 110 ад 28 студзеня 1997 г., які працягнуў тэрмін рэабілітацыі да 1998 г. уключна. Дзяржаўныя органы яўна не спраўляліся з арпацоўкай усёй інфармацыі па рэпрэсаваных.

Безумоўна, нельга не ўлічваць новую маральную атмасферу, якая ўсталявалася ў Беларусі – рабіліся спробы вонкавай рэсаветызацыі, а пры такой палітыцы не варта варушыць багаж мінулых рэпрэсіяў. Але, што праўда, патрэба ў вялікай колькасці новых дакументаў адпала, бо папярэдне была напрацаваная юрыдычная база працэсу рэабілітацыі. Гэтыя законы дзейнічаюць і цяпер, бо тэрміны рэабілітацыі ўстанаўлівалі для дзяржаўных органаў абавязковыя храналагічныя рамкі, у якіх яны былі павінныя самі праводзіць працэс рэабілітацыі і кампенсацыі стратаў. Грамадзяне Беларусі – ахвяры рэпрэсіяў і іх нашчадкі, могуць выяўляць сваю ініцыятыву самастойна і дамагацца гэтым самым ад дзяржавы выканання яе ўласных законаў.

**Дзе шукаць інфармацыю?**

1) У *архівах КГБ* захоўваецца справы на людзей, якія былі рэпрэсаваныя паводле палітычных матывах. Як сцвярджаюць

---

[33] *Реабилитация: Политические процессы 30—50-х годов.* С. 329.

[34] А д а м у ш к а У. І. *Палітычныя рэпрэсіі...* С. 145.

даследчыкі, гэта звыш 175 000 спраў на 250 000 чалавек[35]. Паводле беларускіх законаў КГБ абавязанае прадастаўляць такую інфармацыю рэпрэсаваным і іх сваякам.

2) У *архівах органаў унутраных спраў* захоўваюцца матэрыялы па рэпрэсіях у адміністрацыйным парадку: раскулачванне, высылка, ссылка, высяленне па-за межы Белаурсі на спецпасяленне.

3) У *абласных і занальных архівах* знаходзяцца матэрыялы па рэпрэсіях таксама ў адміністрацыйным парадку розных перыядаў, спісы выселеных і накіраваных на спецпасяленне ў паваенны час.

4) *Матэрыялы Камісіі па аказанню садзеяння ў забеспячэнні правоў ахвяраў палітычных рэпрэсіяў 1920—1980-х гадоў*, якую ў 1951—1995 гг. узначальваў В. Піскароў, захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь.

5) Асобую ўвагу варта звярнуць на *Імянную картатэку на асобаў, неабгрунтавана рэпрэсаваных па палітычных матывах у 20—50-ых гадах і пазней рэабілітаваных*, якая створаная ў *Дзяржаўным Камітэце па Архівах і Справаводству Рэспублікі Белаурсь* пад кіраўніцтвам Уладзіміра Адамушкі. Інфармацыя для картатэкі пастурала ад КГБ і МУС, а таксама ад мясцовых орагнаў. На 1997 г. картатэка налічвала 150 000 картак персанальнага ўліку, 50 000 з якіх былі ўнесеныя ў камп'ютар. Гэтыя карткі ўтрымліваюць асноўныя біяграфічныя звесткі і складзеныя яны на аснове першакрыніц (пратаколы, судовыя справы і г. д.).

## ПАРАДЫ

1. *Ніколі не позна* самім рэпрэсаваным і іх нашчадкам звяртацца па аднаўленне грамадзянскіх правоў. Паўторымся яшчэ раз, што тыя тэрміны, якія ўсталёўваліся ў 1990 г. (да 1993 г. уключна), у 1993 г. (да 1996 г. уключна) і ў 1997 г. (да 1998 г. уключна), тычыліся арганізацыі працы ў дзяржаўных органах. Наколькі нам вядома не ўсе рэпрэсаваныя, а таксама іх нашчадкі, дачакаліся юрыдычнай рэабілітацыі.

2. Законы Беларусі вызначылі *парадак юрыдычнай рэабілітацыі.* Пазасудовыя рашэнні, вынесеныя ў 20—50-х гадах, былі адмененыя яшчэ ў 1989 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Беларускае заканадаўства прызнала неабходным рэабілітаваць таксама асобнаў, якія падпалі пад рэпрэсіі ў адміністарцыйным парадку (якія былі сасланыя, высланыя, накіраваныя на спецпасяленне, выдаленыя па-за межы Беларусі, у якіх канфіскоўвалася маймасць, але самі яны не высяляліся). З патрабаваннем рэабілітацыі трэба звяртацца ў Пракуратуру Беларусі ці абласную пракуратуру. Звяртацца могуць не толькі рэпрэсаваныя, але і іх сваякі і блізкія, а таксама іншыя грамадзяне і арганізацыі. Гэта азначае, што калі вядома пра рэпрэсіі супраць

[35] А д а м у ш к а У. Абвінавачваюць лічбы: Гістарыяграфія і крыніцы па праблеме палітычных рэпрэсій 1920—1950-ых гадоў на Беларусі // *Беларуская мінуўшчына*. 1997, № 5. С. 21—23.

нейкага чалавека, і вядома таксама, што ён не быў рэабілітаваны, то практычна любы грамадзянін можа патрабаваць рэабілітацыі гэтага чалавека. Нават калі ў адпаведных органах не захаваліся дакументы пра рэпрэсіі супраць нейкага чалавека, то збіраюцца паказанні сведкаў.

Працэдура рэабілітацыі даволі дэталізавана распісаная ў Пастанове Вярхоўнага Савета Беларусі ад 6 чэрвеня 1991 г. "Аб парадку рэабілітацыі ахвяраў палітычных рэпрэсіяў 20—50-х гадоў у Беларускай ССР". У далейшыя гады ў гэтую Пастанову ўносіліся змены, у тым ліку пашыранае само разуменне перыяду, у які адбываліся рэпрэсіі: 20—80-я гады.

3. Апроч юрыдычнай рэабілітацыі беларуске заканадаўства прадугледжвае *кампенсацыю матэрыяльных стратаў*. Гэты бок рэабілітацыі падрабязна асветлены найперш ў "Палажэнне аб парадку аднаўлення правоў грамадзянаў, пацярпеўшых ад рэпрэсіяў ў 20—50-х гадах", зацверджаным Пастановай Вярхоўнага Савету Беларусі 21 снежня 1990 г. з далейшымі дапаўненнямі. Акты парламента дапаўняюць Пастановы Савета Міністраў. З заявамі аб прызначэнні і выплаце кампенсацыі трэба звяртацца ў мясцовыя органы ўлады; Саветам Міністрам у 1992 г. была зацверджаная нават форма адпаведнай Заявы. Дзейнічае цэлы шэраг льготаў, якія могуць быць важнымі для канкрэтных асобаў (праўда, часткова гэтыя льготы былі адмененыя прэм'ер-міністрам Міхаілам Чагіром). Пастанова Вярхоўнага Савета Беларусі ад 1 лістапада 1991 г. недвухсэнсоўна зафіксавала наступную сітуацыю: "Аднаўленне правоў, кампенсацыя стратаў і прадастаўленне льготаў рэабілітаваным асобам праводзіцца незалежна ад тэрміну іх рэабілітацыі, але з улікам выплат кампенсацыяў, праведзеных раней". Вам могуць спатрэбіцца мясцовыя архівы, якія абавязаныя бясплатны адшукаць у сваіх зборах адпаведныя дакументы. Магчымасці кампенсацыі ёсць нават у тым выпадку, калі не захаваліся дакументы. Іншая рэч, што сам памер кампенсацыі абмежаваны – паводле Закона Рэспублікі Беларусь "Аб унясенні зменаў і дапаўненняў ў Палажэнне аб парадку аднаўлення правоў грамадзянаў, пацярпеўшых ад рэпрэсіяў ў 20—80-х гадах" гэтая кампенсацыя не можа перавышаць ста мінімальных заработных платаў, якія ўстаноўленыя на момант выплаты кампенсацыі.

Вельмі сур'ёзная праблема – рэстытуцыя (вяртанне) нерухомасці. Тэарэтычнаіснуе магчымасць вяртання "грамадзянам канфіскаванай маймасці ў натуры, а па іх жаданню ці пры немагчымасці вяртання ў натуры – ...вяртання яго кошту". Але тут жа Вярхоўны Савет удакладніў: "Не падпадаюць пад вяртанне (кампенсацыю) жылыя дамы і іншыя збудаванні, якія былі нацыяналізаваныя (муніцыпалізаваныя)... на аснове заканадаўства, якое дзейнічала ў той перыяд, а таксама будынкі і іншая маёмасць, знішчаныя ў гады Вялікай Айчыннай вайны" ("Палажэнне аб парадку аднаўлення правоў грамадзянаў,

пацярпеўшых ад рэпрэсіяў ў 20—50-х гадах", зацверджанае 21 снежня 1990 г.; пункт 6).
Але і тут сітуацыя не безнадзейная і свая спецыфіка ёсць у Заходняй Беларусі. Можна прывесці тут прыклад з Паставаў. У трыццатых гадах на цэнтральнай плошчы гэтага горада майстра-кравец Мікалай Галубоўскі пабудаваў свой дом, які ўпісаўся ўпісаўся ў комплекс гістарычнай забудовы. У снежні 1939 гэты дом быў адабраны новай савецкай уладай. Але нашчадкі краўца Галубоўскага захавалі ўсе паперы і раённы пастаўскі суд прыняў рашэнне аб вяртанні дома законным уладарам на той падставе, што ўлады адабралі будынак яшчэ да прыняцца ў маі 1940 г. Пастановы Саўнаркома аб нацыяналізацыі і муніцыпалізацыі нерухомасці ў Заходняй Беларусі. Віцебскі абласны суд пакінуў гэтае рашэнне сапраўдным[36].
Як бачым, пытанне з рэстытуцыяй нерухомасці юрыдычна да канца не вырашанае ў Беларусі. Гэта тэма, бадай, надалей будзе дыскутавацца. Кропка, прынамсі, тут яшчэ не пастаўленая. Пакуль што галоўнае прыхоўваць ці шукаць дакументы, якія пацвярджаюць Вашыя правы на нерухомасць. І памятаць, што міжнародныя законы не прызнаюць тэрмін даўнасці ў дачыненні да злачынстваў супраць чалавецтва.

4. Беларускае заканадаўства прадугледжвае *ўвекавечанне памяці ахвяраў рэпрэсіяў.* Прадугледжана складанне спісаў усіх рэпрэсаваных. 1 студзеня 1991 г. у Камітэце па архівах і справаводству пры ўрадзе Белаурсі быў створаны Навукова-інфармацыйны аддзел па справах рэпрэсіраваных грамадзянаў, які ўзначаліў Уладзімір Адамушка. КГБ, МУС і іншыя дзяржаўныя органы перадавалі туды інфармацыю пра рэпрэсаваных. На 1994 г. Аддзел меў электронную картатэку ўжо на 70 тыс. асобаў. Гэтыя спісы часткова друкаваліся ў мясцовай прэсе, а таксама ў некаторых кнігах серыі «Гісторыка-дакументальнай хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі "Памяць"», чаго асабліва патрабаваў Прэзідыум Вярхоўнага Савета ў сваёй Пастанове ад 27 снежня 1991 г. Але трэба прызнаць, што ў тых кнігах "Памяці", якія выйшлі ў канцы 1990-х гадоў, гэтыя спісы пачалі знікаць. Ёсць усе маральныя і юрыдычныя падставы прапаноўваць Раённым камісіям па стварэнню хронікі і Рэдакцыі серыі "Памяць" публікаваць спісы ахвяраў рэпрэсіяў.
Вельмі складана цяпер устанаўліваць помнікі ў памяць рэпрэсаваным, мясцовыя ўлады імкнуцца ўхіліцца ад гэтага ўвогуле, а ў Курапатах, да прыкладу, гэтую тэму сабатуе цэнтральная ўлада. Але трэба зноў жа памятаць, што закон на баку грамадзянаў, якія сталі ахвярамі таталітарнага рэжыму.

## Міжнароднае заканадаўства пра злачынствы

[36] Падрабязней глядзі: А л е с ь К а с ц е н. Каму твой дом, дзядуля Галубоўскі? // *Звязда.* 31 снежня 1993 – 1 студзеня 1994; ён жа, «Жывём у помніку. Цяжка» // *Звязда.* 1999, 25 жніўня.

## супраць чалавецтва

Пераняссенне праблематыкі рэпрэсіяў у кантэкст міжнароднага заканадаўства пра злачынствы супраць чалавецтва дазваляе разглядаць гэтыя злачынствы без прымянення да іх тэрміну даўнасці. Гэты прынцып выразма замацаваны ў Канвенцыі ААН ад 26 лістапада 1968 г. «Аб непрымяненні тэрміну даўнасці да ваенных злачынстваў і злачынстваў супраць чалавецтва». Рэзалюцыя Генеральнай Асамблеі ААН ад 3 снежня 1973 г. «Прынцыпы міжнароднага супрацоўніцтва адносна выяўлення, арышту, выдачы і пакарання асобаў, вінаватых у ваенных злачынствах і злачынствах супраць чалавецтва» ўстанаўлівае наступнае палажэнне: «Ваенныя злачынствы і злачынствы супраць чалавецтва, калі б і дзе б яны не здзейсняліся, падлягаюць расследаванню, а асобы, адносна якіх маюцца доказы ў здзяйсненні такіх злачынстваў, -- росшуку, арышту, прыцягненню да судовай адказнасці і, у выпадку прызнання іх віноўнымі, пакаранню».

Але што дазваляе разглядаць палітычныя рэпрэсіі савецкага перыяду як злачынствы супраць чалавецтва? Характарыстыка такіх злачынстваў зробленая яшчэ ў 1945 г. у Статуце Міжнароднага Ваеннага Трыбунала: «Злачынствы супраць чалавечнасці, а менавіта: забойствы, знішчэнне, заняволенне, ссылка ды іншыя жорсткасці, здзейсненыя ў адносінах грамадзянскага насельніцтва да ці пад час вайны, ці праследу паводле палітычных, расавых ці рэлігійных матывах з мэтаю ажыццяўлення ці ў сувязі з любым злачынствам, якое падлягае юрысдыкцыі Трыбунала, незалежна ад таго, ці з'яўляюцца гэтыя дзеянні парушэннем унутранага права краіны, дзе яны былі здзейсненыя, ці не». Як бачым, палітычны праслед у СССР можа быць аднесены да такіх тыпаў злачынстваў, а знішчэнне цэлых груп сялянства з'яўляецца найбольш яркім увасабленнем дэфініцыя злачынства супраць чалавецтва.

Апроч таго, Канвенцыя «Аб непрымяненні тэрміну даўнасці да ваенных злачынстваў і злачынстваў супраць чалавецтва» асуджае «як злачынства супраць чалавецтва парушэнне эканамічных і палітычных правоў карэннага насельніцтва». Гэтая Канвенцыя ў адпаведнасці з міжнародным правам адносіць злачынствы супраць чалавецтва як самыя цяжкія злачынствы. Канвенцыя ААН ад 9 снежня 1948 г. «Аб папярэджанні злачынства генацыда і пакаранняў за яго» дазваляе разглядаць падобныя акцыі супраць насельніцтва Беларусі як генацыд[37].

Непрымяненне тэрміну даўнасці да злачынстваў супраць чалавецтва таксама азначае новы погляд на юрыдычную і

---

[37] Змены колькасных і якасных характарыстыкаў народанасельніцтва ў перыяд рэпрэсіяў аналізуюцца як палітыка генацыду і этнацыду ў наступнай публікацыі: А л е г Д з я р н о в і ч. Да дэмаграфічнага вызначэння масавых рэпрэсіяў камуністычнага рэжыму // *Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX ст.* Матэрыялы навукова-практычнай канфэрэнцыі (Мінск, 27-28 лютага 1998). Мінск, 1998. С. 32-34.

маёмасную рэабілітацыю – гэты працэс мусіць быць даведзены да канца.

KAMUNIKAT.org